

Юлій Збароўскі і Марына Адосій на адкрыцці выставы

✓**11 студзеня** ў Мазыры ў мастацкай галерэі цэнтральнай бібліятэкі імя А.С. Пушкіна «Зачараваныя родным краем» адкрылася персанальная выстава работ мазырскага мастака Юлія Збароўскага. Юлій Францавіч нарадзіўся ў Мазыры ў 1967 г. Сваю творчую дзейнасць пачаў як настаўнік малявання малодшых класаў. Зараз працуе мастаком-афарміцелем Палаца культуры ААТ «Мазырскі НПЗ». На карцінах, выстаўленых у галерэі, можна пабачыць загадкавыя, цікавыя партрэты, розныя сюррэалістычныя сюжэты, якія сапраўды прымушаюць спыніцца, задумацца, паразважаць. Здаецца, што задума арганізатараў гэтай выставы – абудзіць у наведніках уяўленне і разважлівасць – дасягнула сваёй мэты.